# Пагадненне аб самарэгуляванні незалежнага беларускага медыясектара

## Прэамбула

Мы, рэдакцыі незалежных беларускіх медыя і беларускія медыяарганізацыі,

усведамляючы вялікую грамадскую значнасць прафесіі журналіста і выклікі, якія сёння стаяць перад нашай прафесіяй,

усведамляючы, што ацэнка паводзінаў журналістаў і адпаведнасці іх правілам этыкі мусіць быць сферай адказнасці саміх журналістаў, а дзяржаўны прымус у гэтай сферы недапушчальны і заўсёды азначае страту незалежнасці,

усведамляючы, што здольнасць журналісцкай супольнасці самастойна вырашаць этычныя канфлікты, прызнаваць памылкі і несці адказнасць, як і здольнасць абараніць журналіста ад неабгрунтаваных прэтэнзій, падвышае давер грамадства да журналісцкай супольнасці і да журналісцкай працы,

прызнаючы этычныя стандарты, замацаваныя ў Кодэксе прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў, добраахвотна прымаючы на сябе абавязак прытрымлівацца гэтых стандартаў і прасоўваць іх у журналісцкай супольнасці,

маючы намер пашыраць тэрыторыю свабоды выказвання і спрыяць захаванню, умацаванню і развіццю незалежнага беларускага медыясектара,

вырашылі аб’яднаць нашыя намаганні і кампетэнцыі дзеля стварэння інстытута самарэгулявання незалежнага беларускага медыясектара і з гэтай мэтай заключылі дадзенае Пагадненне і ствараем адмысловую сістэму органаў самарэгулявання.

## 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні

У гэтым Пагадненні выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны:

Медыяасамблея — найвышэйшы орган самарэгулявання беларускага медыясектара. У склад Медыяасамблеі ўваходзяць усе рэдакцыі беларускіх медыя і беларускія медыяарганізацыі, якія далучыліся да гэтага Пагаднення (далей — удзельнікі Медыяасамблеі). Медыяасамблея абірае Раду па медыяэтыцы, прымае акты ў сферы самарэгулявання медыясектара і выконвае іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Пагадненнем.

Рада па медыяэтыцы — выбарны орган самарэгулявання, які ствараецца для рэагавання на парушэнні прафесійнай этыкі ў беларускім медыясектары і ўрэгулявання звязаных з гэтым канфліктных сітуацый.

Сакратарыят — орган, які ажыццяўляе тэхнічную і арганізацыйную падтрымку дзейнасці Медыяасамблеі і Рады па медыяэтыцы. Функцыі Сакратарыята выконвае Беларуская асацыяцыя журналістаў.

Рэдакцыя медыя — арганізацыя, якая рэгулярна стварае і распаўсюджвае кантэнт для масавай аўдыторыі.

Медыяарганізацыя — сяброўскае аб’яднанне журналістаў, выдаўцоў, іншых суб’ектаў медыясектара, іншая арганізацыя, дзейнасць якой скіраваная на падтрымку і развіццё медыясектара і абарону правоў яго суб’ектаў.

Азначэнне “беларускі” ў дачыненні да медыя і медыяарганізацый паказвае не на краіну знаходжання, а на скіраванасць дзейнасці на беларускую аўдыторыю, што ўключае беларускіх грамадзян як унутры краіны, так і па-за яе межамі.

## 2. Далучэнне да Пагаднення

Кожная рэдакцыя беларускага медыя ці беларуская медыяарганізацыя можа далучыцца да гэтага Пагаднення. Далучэнне да Пагаднення азначае, што рэдакцыя медыя ці медыяарганізацыя становіцца ўдзельнікам Медыяасамблеі і прымае на сябе адпаведныя абавязкі, прадугледжаныя гэтым Пагадненнем.

Для далучэння да Пагаднення рэдакцыя медыя ці медыяарганізацыя накіроўвае ў Сакратарыят заяву. На працягу 5 дзён Сакратарыят абавязаны ўключыць заяўніка ў рэестр удзельнікаў Медыяасамблеі. З моманту ўключэння ў рэестр рэдакцыя медыя ці медыяарганізацыя лічыцца далучанай да Пагаднення і набывае статус удзельніка Медыяасамблеі.

Паведамленне пра далучэнне новага ўдзельніка накіроўваецца непасрэдна яму, усім астатнім удзельнікам Медыяасамблеі, а таксама публікуецца на інфармацыйных рэсурсах органаў самарэгулявання.

У выключных выпадках, пры відавочнай неадпаведнасці рэдакцыі медыя ці медыяарганізацыі крытэрам удзельніка Медыяасамблеі, Сакратарыят мае права не ўключаць яе ў рэестр, а прыпыніць працэс далучэння і перадаць гэтае пытанне на найбліжэйшае па часе пасяджэнне Медыяасамблеі. Сакратарыят накіроўвае

паведамленне аб гэтым рэдакцыі медыя ці медыяарганізацыі, якая падала заяву аб далучэнні, і ўсім удзельнікам Медыяасамблеі.

## 3. Абавязкі ўдзельнікаў Медыяасамблеі

Рэдакцыі медыя і медыяарганізацыі, якія далучыліся да Пагаднення і набылі статус удзельнікаў Медыяасамблеі, прымаюць на сябе наступныя абавязкі:

- прытрымлівацца ў сваёй дзейнасці Кодэкса прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў, пашыраць яго ўжыванне сярод журналістаў, якія працуюць у медыя ці з'яўляюцца сябрамі медыяарганізацыі, і іншых суб'ектаў беларускага медыясектара;

- прызнаваць кампетэнцыю Рады па медыяэтыцы як органа самарэгулявання, удзельнічаць у яе фармаванні і працы;

- удзельнічаць у пасяджэннях Медыяасамблеі і ў прыняцці ёй рашэнняў.

Рэдакцыя медыя ці медыяарганізацыя нясе адказнасць за публікацыі журналістаў, размешчаныя на рэсурсах гэтага медыя ці медыяарганізацыі. Пры разглядзе Радай па медыяэтыцы звароту ў дачыненні да такой публікацыі, рэдакцыя медыя ці медыяарганізацыя ўдзельнічаюць у гэтым разглядзе разам з журналістам на яго баку.

## 4. Асацыяваныя ўдзельнікі Медыяасамблеі

Суб'екты беларускага медыясектара, якія не з'яўляюцца рэдакцыямі медыя ці медыяарганізацыямі, — журналісты-фрылансеры, медыяменеджары, медыяэксперты і іншыя — могуць далучыцца да гэтага Пагаднення ў якасці асацыяваных удзельнікаў Медыяасамблеі.

Асацыяваныя ўдзельнікі Медыяасамблеі прымаюць на сябе ўсе абавязкі ўдзельнікаў Медыяасамблеі і набываюць аналагічныя з імі правы, за выключэннем права ўдзельнічаць у прыняцці рашэнняў (галасаваць) на пасяджэннях Медыяасамблеі.

Далучэнне да Пагаднення ў якасці асацыяванага ўдзельніка адбываецца ў тым жа парадку, што і пры далучэнні ў якасці ўдзельніка. Пры накіраванні заявы аб далучэнні суб'ект медыясектара мусіць пазначыць, што далучаецца ў статусе

асацыяванага ўдзельніка. Сакратарыят вядзе асобны Рэестр асацыяваных удзельнікаў Медыяасамблеі.

## 5. Выхад і выключэнне са складу ўдзельнікаў Медыяасамблеі

Удзельнік Медыяасамблеі можа ў любы момант выйсці са складу ўдзельнікаў, падаўшы адпаведную заяву ў Сакратарыят. З моманту падачы такой заявы лічыцца, што выхад са складу ўдзельнікаў адбыўся.

Удзельнік Медыяасамблеі, які спыніў сваю дзейнасць у якасці рэдакцыі медыя ці медыяарганізацыі і не выйшаў са складу ўдзельнікаў самастойна, можа быць выключаны з яго рашэннем Медыяасамблеі.

Рада па медыяэтыцы захоўвае за сабой права разглядаць звароты аб меркаваных парушэннях прафесійнай этыкі ў дачыненні да былога ўдзельніка Медыяасамблеі, калі гэтыя меркаваныя парушэнні былі дапушчаныя ім у перыяд знаходжання ў складзе ўдзельнікаў Медыяасамблеі.

## 6. Медыяасамблея

### *6.1. Кампетэнцыя Медыяасамблеі*

- прыняцце актаў у сферы самарэгулявання беларускага медыясектара, ўнясенне зменаў у гэтае Пагадненне і іншыя прынятыя акты;
- выбары сябраў Рады па медыяэтыцы, прыняцце рашэнняў аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў сябраў Рады па медыяэтыцы;
- разгляд справаздач Рады па медыяэтыцы;
- прыняцце рашэнняў аб выключэнні са складу ўдзельнікаў Медыяасамблеі;
- вырашэнне надзвычайных задач, якія адпавядаюць прынцыпам і мэтам гэтага Пагаднення, але не ўрэгуляваныя ім.

### *6.2. Прадстаўніцтва, кворум і прыняцце рашэнняў*

Медыяасамблея ажыццяўляе сваю дзейнасць шляхам правядзення пасяджэнняў.

Удзельнікі Медыяасамблеі ўдзельнічаюць у яго пасяджэннях праз сваіх прадстаўнікоў. Кожны ўдзельнік Медыяасамблеі накіроўвае на пасяджэнне аднаго свайго прадстаўніка, упаўнаважанага галасаваць ад імя ўдзельніка Медыяасамблеі па любых пытаннях, што разглядаюцца на пасяджэнні.

Пасяджэнне Медыяасамблеі лічыцца паўнамоцным, калі на ім прысутнічае не менш за 1/2 ад агульнай колькасці ўдзельнікаў Медыяасамблеі. У выпадку, калі на пасяджэнні адсутнічае патрэбная колькасць удзельнікаў, Сакратарыят прызначае новую дату пасяджэння Медыяасамблеі.

Кожны ўдзельнік Медыяасамблеі на пасяджэнні мае адзін голас. Рашэнне Медыяасамблеі лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала не менш за 1/2 ўдзельнікаў Медыяасамблеі, прысутных на пасяджэнні. Для працэдуры выбараў сябраў Рады па медыяэтыцы прадугледжаныя асобныя правілы галасавання.

### *6.3. Чарговыя і пазачарговыя пасяджэнні*

Пасяджэнні Медыяасамблеі могуць праводзіцца ў чарговым і пазачарговым парадку.

Чарговае пасяджэнне Медыяасамблеі праводзіцца не радзей за адзін раз на год — для разгляду справаздачы Рады па медыяэтыцы і правядзення чарговых выбараў сябраў Рады па медыяэтыцы. Такое пасяджэнне праводзіцца не пазней за 10 дзён да сканчэння паўнамоцтваў сябраў Рады па медыяэтыцы.

Пазачарговыя пасяджэнні Медыяасамблеі праводзяцца ў наступных выпадках:

- для разгляду пытання аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў сябра Рады па медыяэтыцы — на працягу 30 дзён пасля паступлення ў Сакратарыят запыту аб спыненні паўнамоцтваў;
- паводле ініцыятывы не менш за 1/3 ад агульнай колькасці ўдзельнікаў Медыяасамблеі — на працягу 30 дзён пасля паступлення ў Сакратарыят адпаведнай заявы.

Абавязак па прызначэнні даты пасяджэння Медыяасамблеі і арганізацыі яго правядзення ўскладаецца на Сакратарыят.

### *6.4. Парадак паведамлення аб прызначаным пасяджэнні і парадак яго правядзення*

Сакратарыят паведамляе ўдзельнікам Медыяасамблеі аб правядзенні пасяджэння і публікуе аналагічнае паведамленне на інфармацыйных рэсурсах органаў

самарэгулявання не пазней за 15 дзён да прызначанай даты пасяджэння. Паведамленне павінна ўтрымліваць спіс пытанняў, якія будуць разглядацца на пасяджэнні, і іншую неабходную інфармацыю (Рэестр кандыдатаў у сябры Рады па медыяэтыцы і інш.).

Пасяджэнні Медыяасамблеі могуць праводзіцца ў вочнай форме, у фармаце анлайн-канферэнцыі альбо ў камбінаваным фармаце.

Пасяджэнне Медыяасамблеі вядзе Старшыня, які абіраецца ўдзельнікамі пасяджэння на час яго правядзення. Адкрыццё пасяджэння і правядзенне выбараў яго старшыні ажыццяўляе старшыня Рады па медыяэтыцы.

Рашэнні Медыяасамблеі публікуюцца на інфармацыйных рэсурсах органаў самарэгулявання.

## 7. Рада па медыяэтыцы

Кампетэнцыя Рады па медыяэтыцы:

- разгляд зваротаў аб меркаваных парушэннях прафесійнай этыкі журналістаў, дапушчаных удзельнікамі Медыяасамблеі, і прыняцце па іх рашэнняў;
- разгляд па ўласнай ініцыятыве выпадкаў меркаваных парушэнняў прафесійнай этыкі журналістаў, якія выклікаюць вялікі рэзананс у грамадстве;
- урэгуляванне сітуацый, звязаных з меркаванымі парушэннямі прафесійнай этыкі журналістаў, без разгляду зваротаў;
- справаздачнасць перад Медыяасамблеяй (у тым ліку шляхам інфармацыйнай рассылкі пра вынікі працы за пэўны перыяд);
- выданне рэкамендацый і заўваг агульнага характару для журналісцкай супольнасці на падставе практыкі Рады па медыяэтыцы.

Рада па медыяэтыцы складаецца з 7 сябраў, абраных на пасяджэнні Медыяасамблеі з ліку асоб, якія валодаюць высокімі маральнымі якасцямі і прызнанай ў медыясупольнасці прафесійнай кампетэнцыяй. 5 сябраў Рады абіраюцца з ліку журналістаў, медыяменеджараў, выдаўцоў, медыяэкспертаў і іншых прадстаўнікоў медыясектара, 2 сябры абіраюцца з ліку прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, не занятых у медыясектары. Сябры Рады па медыяэтыцы абіраюцца і дзейнічаюць у асабістай якасці, прыналежнасць да

удзельнікаў Медыяасамблеі не з’яўляецца ўмовай для абрання сябрам Рады па медыяэтыцы.

Тэрмін паўнамоцтваў сябра Рады па медыяэтыцы складае тры гады. Асоба не можа займаць пасаду сябра Рады больш за два тэрміны.

Дзейнасцю Рады па медыяэтыцы кіруе старшыня, які абіраецца са складу Рады па медыяэтыцы яе сябрамі. Выбары старшыні Рады па медыяэтыцы праводзяцца пасля кожнай змены складу Рады па медыяэтыцы ў сувязі з ратацыяй ці з іншых прычын.

У выпадку, калі старшыня часова не можа ўдзельнічаць у дзейнасці Рады па медыяэтыцы, Рада па медыяэтыцы абірае са свайго складу асобу, якая выконвае функцыі старшыні ў перыяд яго адсутнасці.

Сябры Рады па медыяэтыцы, улучна са старшынёй, ажыццяўляюць сваю дзейнасць на грамадскіх пачатках.

## 8. Сакратарыят

Сакратарыят выконвае наступныя функцыі:

- вядзенне карэспандэнцыі Рады па медыяэтыцы, у тым ліку рэгістрацыя і перадача ў Раду па медыяэтыцы зваротаў аб меркаваных парушэннях прафесійнай этыкі журналістаў, дасыланне рашэнняў Рады па медыяэтыцы зацікаўленым суб’ектам, рэгістрацыя запытаў аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў сябра Рады па медыяэтыцы, паведамленне ўдзельнікам Медыяасамблеі аб правядзенні пасяджэння Медыяасамблеі;

- вядзенне інфармацыйных рэсурсаў органаў самарэгулявання, у тым ліку публікацыя рашэнняў Рады па медыяэтыцы, публікацыя паведамлення аб правядзенні пасяджэння Медыяасамблеі, публікацыя рашэнняў Медыяасамблеі;

- вядзенне Рэестра ўдзельнікаў Медыяасамблеі;

- вядзенне Рэестра кандыдатаў у сябры Рады па медыяэтыцы;

- прызначэнне пасяджэнняў Медыяасамблеі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Пагадненнем, і арганізацыя іх правядзення;

- арганізацыйная і тэхнічная падтрымка пасяджэнняў Рады па медыяэтыцы.

Функцыі Сакратарыята выконвае Беларуская асацыяцыя журналістаў.

Асоба, выбраная ў склад Рады па медыяэтыцы, не можа ўдзельнічаць у працы Сакратарыята ў перыяд выканання сваіх паўнамоцтваў у Радзе.

## 9. Выбары сябраў Рады па медыяэтыцы

Сябры Рады па медыяэтыцы выбіраюцца Медыяасамблеяй шляхам галасавання. *Галасаванне прызнаецца сапраўдным пры кворуме ў палову ад усіх удзельнікаў Медыяасамблеі.*

Удзельнікі галасавання выбіраюць сябраў Рады з асоб, зарэгістраваных у Рэестры кандыдатаў. Кожны ўдзельнік мае колькасць галасоў, роўную колькасці абраных сябраў Рады. Удзельнік не можа аддаць за аднаго кандыдата больш за адзін голас.

Кандыдаты, якія набралі найбольшую колькасць галасоў, лічацца абранымі, *за выключэннем выпадкаў, калі кандыдат не набраў мінімальны парог галасоў, які складае палову ад колькасці ўдзельнікаў галасавання.*

---

*Варыянт 1*

Пры правядзенні выбараў у першы склад Рады патрабаванне аб мінімальным парозе галасоў не прымяняецца.

---

Варыянт 2

Пры правядзенні выбараў у першы склад Рады мінімальны парог галасоў складае 1/3 частку ад колькасці ўдзельнікаў галасавання.

---

У выпадку, калі па выніках галасавання два альбо больш кандыдаты прэтэндуюць на адно месца, праводзіцца паўторнае галасаванне, і абраным лічыцца кандыдат, які набраў найбольшую колькасць галасоў.

*У выпадку, калі па выніках галасавання ўдзельнікі не абралі неабходную колькасць сябраў Рады, арганізуюцца дадатковыя выбары, у ходзе іх выбіраюцца сябры, якіх не стае. Дадатковыя выбары праводзяцца паводле працэдуры, вызначанай для выбараў сябраў Рады па медыяэтыцы.*

## 10. Фармаванне Рэестра кандыдатаў

---

<u>*Варыянт 1*</u>

***- Намінацыя ўдзельнікамі Медыяасамблеі.***

Рэестр кандыдатаў фармуецца з асоб, намінаваных удзельнікамі Медыяасамблеі, на працягу перыяду, абвешчанага Сакратарыятам.

Кожны ўдзельнік Медыяасамблеі мае права намінаваць аднаго кандыдата, які адпавядае патрабаванням, вызначаным гэтым Пагадненнем для сябраў Рады па медыяэтыцы.

*З мэтай забеспячэння незалежнасці і аб'ектыўнасці, а таксама іншых прынцыпаў працы Рады па медыяэтыцы, кожная намінаваная асоба падпісвае Дэкларацыю сябра Рады па медыяэтыцы.*

Намінаваная асоба лічыцца зарэгістраванай у Рэестры кандыдатаў з моманту атрымання Сакратарыятам наступных дакументаў ад удзельніка Медыяасамблеі:

- паведамленне аб намінацыі,
- прафесійнае рэзюмэ намінаванай асобы,
- *падпісаная намінаванай асобай Дэкларацыя сябра Рады па медыяэтыцы.*

*Калі да моманту завяршэння перыяду намінацыі, абвешчанага Сакратарыятам, колькасць зарэгістраваных асоб у Рэестры кандыдатаў не дазваляе правесці канкурэнтныя выбары, Сакратарыят мусіць працягнуць перыяд намінацыі на тэрмін не больш за 1 месяц.*

--------------------------------------------------------------------------------------------------------------------

<u>*Варыянт 2*</u>

***- Самавылучэнне кандыдатаў.***

Рэестр кандыдатаў фармуецца на падставе працэдуры самавылучэння асоб, якія прэтэндуюць на сяброўства ў Радзе па медыяэтыцы. Перыяд працэдуры самавылучэння вызначаецца і публічна абвяшчаецца Сакратарыятам.

*З мэтай забеспячэння незалежнасці і аб'ектыўнасці, а таксама іншых прынцыпаў працы Рады па медыяэтыцы, кожная асоба, якая ўдзельнічае ў працэдуры самавылучэння, падпісвае Дэкларацыю сябра Рады па медыяэтыцы.*

Асоба лічыцца зарэгістраванай у Рэестры кандыдатаў з моманту атрымання ад яе Сакратарыятам наступных дакументаў:

- прафесійнае рэзюмэ намінаванай асобы,
- *падпісанай Дэкларацыі сябра Рады па медыяэтыцы,*
- *2 рэкамендацыйных лістоў, якія пацвярджаюць кваліфікацыю і рэпутацыю асобы.*

*Калі да моманту заканчэння перыяду працэдуры самавылучэння, абвешчанага Сакратарыятам, колькасць зарэгістраваных асоб у Рэестры кандыдатаў не дазваляе правесці канкурэнтныя выбары, Сакратарыят мусіць працягнуць гэты перыяд на тэрмін не больш за 1 месяц.*

## 11. Рэзервовыя сябры Рады па медыяэтыцы

Для забеспячэння бесперапыннай працы Рады па медыяэтыцы могуць быць абраныя рэзервовыя сябры. Колькасць рэзервовых сябраў пры Радзе не можа перавышаць 5 асоб *(Варыянт — 3 асобы)*.

Рэзервовыя сябры могуць быць абраныя на любых выбарах сябраў Рады пры ўмове наяўнасці вольных пасад рэзервовых сябраў пры Радзе. Колькасць рэзервовых сябраў, якія могуць быць абраныя на выбарах, роўная колькасці вольных месцаў рэзервовых сябраў пры Радзе.

Рэзервовым сябрам Рады па медыяэтыцы становіцца кандыдат, які набраў падчас галасавання мінімальны парог галасоў у палову ад колькасці ўдзельнікаў галасавання, але не быў абраны ў якасці сябра Рады. *У выпадку, калі колькасць кандыдатаў, якія адпавядаюць гэтым крытэрам, перавышае колькасць рэзервовых сябраў, якія могуць быць абраныя на выбарах, рэзервовымі сябрамі становяцца тыя кандыдаты, якія набралі найбольшую колькасць галасоў.*

Тэрмін, на які абіраецца рэзервовы сябра, складае 3 гады. Рэзервовыя сябры могуць быць абраныя неабмежаваную колькасць разоў.

Рэзервовыя сябры не падлягаюць ратацыі.

Неабранне рэзервовых сябраў падчас галасавання не перашкаджае прызнаць, што выбары адбыліся.

Знаходжанне асобы ў статусе рэзервовага сябра не залічваецца ў тэрмін знаходжання ў статусе сябра Рады па медыяэтыцы.

Знаходжанне ў статусе рэзервовага сябра можа быць спыненае датэрмінова па ўласным жаданні альбо рашэннем Медыяасамблеі. Медыяасамблея можа прыняць рашэнне аб датэрміновым спыненні знаходжання асобы ў статусе рэзервовага сябра ў выпадку:

- парушэння прынцыпу павагі да правоў і годнасці іншых асоб, якое можа падарваць давер грамадскасці да аб'ектыўнасці і незалежнасці Рады;
- учынення дзеянняў, якія дазваляюць абгрунтавана ўзяць пад сумнеў прыхільнасць асобы да Дэкларацыі сябра Рады па медыяэтыцы і/альбо яе здольнасць прытрымлівацца ўмоў гэтай Дэкларацыі ў выпадку ўступлення ў паўнамоцтвы сябра Рады.

Да датэрміновага спынення знаходжання асобы ў статусе рэзервовага сябра прымяняюцца правілы працэдуры, прадугледжаныя гэтым Пагадненнем для датэрміновага спынення паўнамоцтваў сябра Рады.

## 12. Ратацыя

Для забеспячэння ратацыі штогод праводзіцца замена часткі сябраў Рады па медыяэтыцы.
Першы склад Рады выбіраецца з рознымі тэрмінамі паўнамоцтваў: два сябры будуць абраныя на 1 год, два — на 2 гады, а тры — на 3 гады. Тэрмін абрання сябра першага складу Рады вызначаецца лёсаваннем.

Для забеспячэння бесперапыннасці працы Рады па медыяэтыцы сябры, чый тэрмін паўнамоцтваў завяршаецца, працягваюць выконваць свае абавязкі да моманту абрання і зацвярджэння новых сябраў.

## 13. Датэрміновае спыненне паўнамоцтваў

Паўнамоцтвы сябра Рады па медыяэтыцы спыняюцца датэрмінова па ўласным жаданні сябра альбо рашэннем Медыяасамблеі.

### *13.1. Добраахвотнае складанне паўнамоцтваў*

Сябра Рады па медыяэтыцы, які жадае датэрмінова спыніць свае паўнамоцтвы, паведамляе пра гэта Медыяасамблеі шляхам звароту ў Сакратарыят.

Днём спынення паўнамоцтваў лічыцца дзень такога паведамлення.

### *13.2. Адхіленне ад пасады паводле рашэння Медыяасамблеі*

Медыяасамблея можа прыняць рашэнне аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў у выпадку парушэння сябрам Дэкларацыі сябра Рады па медыяэтыцы, у тым ліку:

- сістэматычнае невыкананне абавязкаў па ўдзеле ў працы Рады,
- парушэнне прынцыпаў празрыстасці, незалежнасці, непрадузятасці, канфідэнцыйнасці пры выкананні сваіх абавязкаў у якасці сябра Рады,
- *парушэнне прынцыпу павагі да правоў і годнасці іншых асоб, якое можа падарваць давер грамадскасці да аб'ектыўнасці і незалежнасці Рады.*

Ініцыятарам працэдуры разгляду Медыяасамблеяй пытання аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў сябра Рады могуць выступаць:

- сябра Рады па медыяэтыцы,
- ¼ частка ўдзельнікаў Медыяасамблеі.

### *13.3. Працэдура*

Ініцыятар працэдуры накіроўвае ў Сакратарыят запыт з абгрунтаваннем датэрміновага спынення паўнамоцтваў сябра Рады Медыяасамблеяй. Сакратарыят паведамляе Медыяасамблеі, а таксама сябру Рады, датычна якога ініцыюецца працэдура, пра атрыманы запыт.

Медыяасамблея, не пазней за 30 дзён з моманту атрымання паведамлення ад Сакратарыята, склікае пазачарговае пасяджэнне для разгляду пытання аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў сябра Рады.

Ініцыятар працэдуры і сябра Рады па медыяэтыцы, датычна якога была ініцыяваная працэдура, запрашаюцца для ўдзелу ў пасяджэнні. Пасяджэнне можа быць праведзенае без удзелу названых асоб толькі ў выпадках іх адмовы альбо ўхілення ад удзелу.

Падчас пасяджэння Медыяасамблея разглядае запыт ініцыятара працэдуры, заслухоўвае аргументы бакоў і праводзіць абмеркаванне. Па выніках разгляду Медыяасамблея праводзіць галасаванне.

***13.4. Прыняцце рашэння і апавяшчэнне сябра***

Рашэнне аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў сябра Рады па медыяэтыцы *прымаецца кваліфікаванай большасцю (не менш за ⅔)* ад агульнай колькасці ўдзельнікаў Медыяасамблеі.

Медыяасамблея апавяшчае сябра Рады, датычна якога была ініцыяваная працэдура, аб прынятым рашэнні.

Днём спынення паўнамоцтваў лічыцца дзень апавяшчэння сябра Рады аб рашэнні Медыяасамблеі датэрмінова спыніць паўнамоцтвы гэтай асобы.

## 14. Пазачарговая замена сябра Рады па медыяэтыцы

У выпадку датэрміновага спынення паўнамоцтваў сябра Рады па медыяэтыцы на астатні тэрмін яго месца займае рэзервовы сябра, які вызначаецца Сакратарыятам пры дапамозе лёсавання.

## 15. Пазачарговыя выбары сябраў Рады па медыяэтыцы

Калі колькасць дзеючых сябраў Рады па медыяэтыцы не дасягае неабходнага кворуму, устаноўленага гэтым Пагадненнем, Медыяасамблея праводзіць пазачарговыя выбары паводле працэдуры, прадугледжанай для выбараў сябраў Рады па медыяэтыцы.

# РАЗГЛЯД ЗВАРОТАЎ РАДАЙ ПА МЕДЫЯЭТЫЦЫ

## 16. Адносна каго прымаюцца і разглядаюцца звароты

Рада па медыяэтыцы прымае і разглядае звароты адносна:

- журналістаў (*у тым ліку фрылансераў-?*), рэдакцый медыя і медыяарганізацый, якія далучыліся да Пагаднення аб самарэгуляванні беларускага медыясектара і Кодэкса прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў;
- журналістаў (*у тым ліку фрылансераў -?*), рэдакцый медыя і медыяарганізацый, якія не далучыліся да Пагаднення аб самарэгуляванні беларускага медыясектара і Кодэкса прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў, але далі згоду на разгляд звароту Радай.

## 17. Права звароту ў Раду па медыяэтыцы

Правам звароту ў Раду па медыяэтыцы валодаюць:

- кожны чалавек (як фізічная асоба ці прадстаўнік пэўнай групы/аб'яднання), групы/аб'яднанні і юрыдычныя асобы, які/якія лічаць, што публікацыя канкрэтнага журналіста, рэдакцыі медыя ці медыяарганізацыі супярэчыць асноўным прынцыпам і агульнапрынятым этычным нормам журналістыкі;
- *варыянт: кожны чалавек (як фізічная асоба ці прадстаўнік пэўнай групы/аб'яднання - ?), група/аб'яднанне ці юрыдычная асоба, якіх непасрэдна датычыцца публікацыя, якая ўтрымлівае меркаванае парушэнне журналісцкай этыкі;*

Рада па медыяэтыцы мае паўнамоцтвы па ўласнай ініцыятыве пачаць разгляд выпадкаў парушэння прафесійна-этычных норм журналістыкі, якія маюць сур'ёзнае значэнне для медыясектара, абмяркоўваюцца ў медыйным асяродку і сярод грамадзян. Пры гэтым Рада па медыяэтыцы не абавязаная рэагаваць на ўсе без выключэння этычныя парушэнні, якія адбываюцца ў медыя.

## 18. Парадак падачы звароту

Зварот у Раду па медыяэтыцы падаецца ў пісьмовым выглядзе шляхам запаўнення электроннай формы, размешчанай на інфармацыйных рэсурсах органаў самарэгулявання.

Зварот павінен быць пададзены ў Раду па медыяэтыцы не пазней чым праз год з моманту апублікавання ў медыя матэрыялу, які з'яўляецца прадметам звароту.

Зварот у Раду па медыяэтыцы павінен утрымліваць наступныя звесткі:

1. імя і прозвішча заяўніка альбо поўная назва юрыдычнай асобы, назва групы/аб'яднання, які/якая падае зварот;
2. назва медыя, медыяарганізацыі, імя і прозвішча журналіста (альбо псеўданім), у дачыненні да якога/якой падаецца зварот;
3. дата апублікавання матэрыялу, які з'яўляецца прадметам звароту;
4. назва артыкула альбо праграмы, у якой змяшчаецца інфармацыя, што з'яўляецца прадметам звароту;
5. апісанне сутнасці меркаванага парушэння, якое з'яўляецца прадметам звароту;
6. копія публікацыі (поўная) альбо спасылка на электронную версію інтэрнэт-выдання з указаным HTTP-адрасам, у якім быў размешчаны спрэчны матэрыял.

Зварот рэгіструецца Сакратарыятам і перадаецца для далейшага рэагавання старшыні Рады па медыяэтыцы. Старшыня Рады прымае да разгляду зварот самастойна альбо даручае адказнаму сябру Рады камунікацыі з бакамі канфлікту, вывучэнне сітуацыі і падрыхтоўку матэрыялаў да пасяджэння Рады.

Рада па медыяэтыцы разглядае пытанні, якія тычацца паводзінаў ці дзеянняў журналістаў, рэдакцый і медыяарганізацый толькі ў той частцы, у якой гэта можа быць ацэнена як парушэнне Кодэкса прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў.

Рада па медыяэтыцы мае права адмовіць у разглядзе звароту ў наступных выпадках:

- патрабаванні да звароту не выкананыя;
- калі яна лічыць, што яго разгляд не ўваходзіць у кампетэнцыю Рады па медыяэтыцы;
- калі зварот відавочна неабгрунтаваны (выкладзены блытана і неахайна, незразумела, у чым заключаецца меркаванае парушэнне журналісцкай этыкі);

- калі ў кампетэнтным судзе распачатая адпаведная вытворчасць па спрэчцы.

## 19. Урэгуляванне сітуацыі без разгляду звароту

Пры камунікацыях з бакамі звароту старшыня Рады па медыяэтыцы (ці адказны сябра Рады) можа прапанаваць бакам урэгуляваць канфлікт без разгляду звароту Радай па медыяэтыцы.

Такая прапанова паступае ў выпадках, калі журналіст, рэдакцыя медыя ці медыяарганізацыя, датычна якога/якой паступіў зварот, на стадыі папярэдніх камунікацый прызнае, што ў публікацыі была дапушчаная памылка і гатовы/ая яе выправіць і прынесці непублічныя ці публічныя прабачэнні, у тым ліку шляхам апублікавання адпаведнага матэрыялу ў медыя. Аўтар звароту ў сваю чаргу згодны з прапанаваным варыянтам рэагавання на свой зварот.

Пры замірэнні бакоў на дадзенай стадыі зварот у Раду па медыяэтыцы застаецца без разгляду. Прадстаўнік Рады па медыяэтыцы, які вёў камунікацыі, інфармуе пра замірэнне бакоў астатніх сябраў Рады.

## 20. Рашэнні Рады па медыяэтыцы

Формы рашэнняў, якія могуць прымацца Радай па медыяэтыцы па выніках разгляду зваротаў:

- заява Рады, у якой выкладаецца рашэнне аб парушэнні альбо адсутнасці парушэння Кодэкса прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў. Заява Рады публікуецца Сакратарыятам на інфармацыйных рэсурсах органаў самарэгулявання, а таксама накіроўваецца журналістам, кіраўнікам рэдакцый медыя ці медыяарганізацый, якія сталі аб'ектамі разгляду Рады; асобе, якая накіравала зварот. *Аб'екты звароту публікуюць альбо не публікуюць заяву Рады па медыяэтыцы на ўласных інфармацыйных рэсурсах па ўласным меркаванні.*

- заява аб недапушчальнасці падобных парушэнняў (*варыянт: заява публічнага асуджэння*) выкарыстоўваецца ў выпадках, калі дзеянні журналіста, рэдакцыі медыя альбо медыяарганізацыі прызнаныя Радай надзвычай сур'ёзным парушэннем норм журналісцкай этыкі і цалкам несумяшчальныя з паняццямі прафесійнай журналістыкі. Заява Рады публікуецца на інфармацыйных рэсурсах органаў самарэгулявання,

накіроўваецца заяўніку і аб’екту разгляду звароту. Рада і Сакратарыят прыкладаюць намаганні, каб заява як мага шырэй была распаўсюджаная ў беларускім медыясектары.

## 21. Парадак працы Рады па медыяэтыцы

Разгляд зваротаў і прыняцце рашэнняў адбываецца на пасяджэннях Рады па медыяэтыцы. Пасяджэнні Рады могуць праходзіць у афлайн-, анлайн- і змяшаных фарматах.

Звароты разглядаюцца ў разумна кароткі тэрмін, *неабходны для вывучэння матэрыялаў, папярэдніх камунікацый з бакамі канфлікту, склікання пасяджэння Рады і запрашэння ўсіх зацікаўленых асоб*. Пры гэтым тэрмін разгляду не можа перавышаць адзін месяц *(два месяцы)*.

Дзеючы склад Рады павінен завершыць разгляд прынятых да разгляду зваротаў да выбараў наступнага складу Рады. Звароты, якія паступілі пазней, чым за 10 дзён да выбараў, перадаюцца на разгляд новаму складу Рады.

### *21.1. Парадак склікання, падрыхтоўка да пасяджэння Рады па медыяэтыцы*

Пасяджэнні Рады праводзяцца па меры паступлення зваротаў для разгляду. Пасяджэнні склікае і праводзіць старшыня Рады. Пасяджэнне можа склікацца таксама на патрабаванне не менш за 3 сябраў Рады.

Паведамленне пра скліканне пасяджэння павінна быць накіраванае сябрам Рады *праз абраны і ўзгоднены сябрамі Рады бяспечны канал сувязі* не менш чым за тры дні *(пяць дзён)* да меркаванай даты пасяджэння. Дата і фармат пасяджэння ўзгадняюцца сябрамі Рады супольна. Дакументы і матэрыялы, якія падлягаюць разгляду, прадстаўляюцца старшынёй Рады альбо адказным сябрам Рады, які вёў папярэднія камунікацыі з бакамі канфлікту, не пазней чым за 3 дні да пасяджэння.

На пасяджэнне Рады запрашаюцца бакі канфлікту (аўтары зваротаў і журналісты ці прадстаўнікі суб’ектаў, датычна якіх пададзены зварот) і прадстаўнік Сакратарыята. Рада мае права запрасіць на пасяджэнне іншых асоб, прысутнасць і тлумачэнні якіх на пасяджэнні мэтазгодныя. Паводле рашэння Рады на пасяджэнне могуць быць запрошаныя прадстаўнікі медыя.

### *21.2. Пасяджэнне Рады па медыяэтыцы*

Пасяджэнні Рады з'яўляюцца правамоцнымі, калі на іх прысутнічае не менш за 5 сябраў Рады.

На пачатку пасяджэння старшыня Рады вызначае, ці ёсць неабходны кворум для прыняцця рашэння, у выпадку наяўнасці кворуму абвяшчае пра пачатак пасяджэння і інфармуе пра прысутнасць ці адсутнасць на ім бакоў канфлікту, прысутнасць іншых запрошаных.

*На кожным пасяджэнні старшыня Рады прызначае сакратара, які вядзе пратакол пасяджэння. Пратакол перадаецца старшыні Рады і захоўваецца Сакратарыятам.*

Старшыня Рады агучвае змест звароту пра меркаванае парушэнне журналісцкай этыкі альбо просіць прадставіць яго адказнага сябра Рады, які вёў папярэднія камунікацыі з бакамі канфлікту. Пасля гэтага свае аргументы выкладаюць заяўнік, затым журналіст, прадстаўнік рэдакцыі медыя ці медыяарганізацыі, у дачыненні да якога/якой паступіў зварот. У выпадку прысутнасці іншых асоб, запрашэнне якіх на пасяджэнні было расцэненае як мэтазгоднае, заслухоўваюцца іх тлумачэнні. Задаваць пытанні і ўдакладненні падчас пасяджэння могуць толькі сябры Рады і бакі канфлікту.

Пры разглядзе звароту ў адсутнасць запрошаных бакоў канфлікту Камісія абмяжоўваецца даследаваннем прадстаўленых імі матэрыялаў і аргументаў, выкладзеных у звароце і падчас папярэдніх камунікацый, і на іх падставе выносіць рашэнне.

У выпадку асабістай зацікаўленасці аднаго ці некалькіх сябраў Рады ў канкрэтнай сітуацыі, каб пазбегнуць канфлікту інтарэсаў, гэты сябра ці сябры Рады самаадхіляецца *(адхіляецца)* ад галасавання па дадзеным звароце. Пры гэтым такія сябры Рады маюць права на пасяджэнні выказваць свае меркаванні.

Рашэнні прымаюцца адкрытым галасаваннем сябраў Рады. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала не менш за 4 прысутных на пасяджэнні сябраў Рады, якія маюць права голасу.

### *21.3. Абскарджанне рашэнняў*

Рашэнні Рады па медыяэтыцы, прынятыя па выніках разгляду індывідуальных зваротаў, абскарджанню не падлягаюць.

*Рада па медыяэтыцы мае права па ўласнай ініцыятыве перагледзець, змяніць ці адмяніць прынятае раней рашэнне ў выпадку выяўлення новых акалічнасцяў, якія былі невядомыя Радзе падчас разгляду звароту.*

## 22. Заключныя палажэнні

Гэтае Пагадненне ўступае ў сілу з моманту, калі да яго далучылася не менш за дваццаць рэдакцый медыя і медыяарганізацый.

На працягу 60 дзён з моманту ўступлення Пагаднення ў сілу Сакратарыят арганізуе і праводзіць пасяджэнне Медыяасамблеі для выбараў першага складу Рады па медыяэтыцы.

Змены ў гэтае Пагадненне ўносяцца рашэннем Медыяасамблеі, калі за такое рашэнне прагаласавала большасць ад агульнай колькасці ўдзельнікаў Медыяасамблеі.

*Дадатак 1*

**Дэкларацыя сябра Рады па медыяэтыцы**

Я, ________________ (П.І. кандыдата), у выпадку майго абрання сябрам Рады па медыяэтыцы лічу сябе абавязаным:

**Прытрымліванне Кодэкса і Пагаднення**

- Прытрымлівацца Кодэкса прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў.
- Прытрымлівацца Пагаднення аб самарэгуляванні беларускага медыясектара і добрасумленна выконваць абавязкі, якія яно накладае на сябраў Рады, у тым ліку ўдзел у пасяджэннях, разгляд скаргаў і прыняцце рашэнняў па іх.

*Празрыстасць*

- Падтрымліваць празрыстасць у дзеяннях Рады і ў сваёй дзейнасці як сябра Рады.

*Незалежнасць і неперадузятасць*

- Пры выкананні сваіх абавязкаў у Радзе па медыяэтыцы дзейнічаць выключна ў інтарэсах грамадскасці і забяспечваць неперадузяты разгляд скаргаў.
- Своечасова паведамляць пра любыя патэнцыйных альбо рэальныя канфлікты інтарэсаў і не ўдзельнічаць у разглядзе спраў, дзе такія канфлікты могуць паўплываць на маю аб'ектыўнасць.

*Канфідэнцыйнасць*

- Выконваць канфідэнцыйнасць інфармацыі, атрыманай у ходзе выканання абавязкаў сябра Рады.
- Не выкарыстоўваць інфармацыю, атрыманую ў межах працы Рады, у асабістых інтарэсах альбо ў інтарэсах трэціх асоб.

*Роўнасць і павага*

- Дзейнічаць з павагай да правоў і годнасці іншых людзей як у прафесійным, так і ў асабістым жыцці.

Дата: ________________
Подпіс: ________________
П.І. кандыдата: ________________

*Дадатак 2*

**Форма звароту ў Раду па медыяэтыцы**

1. імя і прозвішча заяўніка альбо поўная назва юрыдычнай асобы, назва групы/аб’яднання, які/якая падае зварот;
2. назва медыя, медыяарганізацыі, імя і прозвішча журналіста (альбо псеўданім), у дачыненні да якога/якой падаецца зварот;
3. дата публікацыі матэрыялу, які з’яўляецца прадметам звароту;
4. назва артыкула альбо праграмы, у якой змяшчаецца інфармацыя, што з'яўляецца прадметам звароту;
5. апісанне сутнасці меркаванага парушэння, якое з'яўляецца прадметам звароту;
6. дадайце поўную копію публікацыі альбо спасылку на электронную версію інтэрнэт-выдання з указаным HTTP-адрасам, у якім быў размешчаны спрэчны матэрыял.